# МУЗЕЙНАЯ АНІМАЦЫЯ ЯК СРОДАК ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ ПАДЛЕТКАЎ

**А. В. Рабава,** *кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Сацыяльны заказ у галіне выхавання падрастаючага пакалення арыентуе на фарміраванне асобы грамадзяніна, патрыёта, працаўніка. Сучасныя тэндэнцыі развіцця адукацыі, сярод якіх вяртанне да агульначалавечых маральных якасцей і традыцый народа, адраджэнне цікавасці да беларускай культуры і мовы і інш., вызначаюць задачы і змест выхаваўчай работы з дзецьмі і навучэнскай моладдзю. У аснове патрыятызму і грамадзянскасці ляжаць пачуцці любові да роднай зямлі і народа, павагі да гісторыі сваёй айчыны, нацыянальнай культуры, традыцый, звычаяў.

Выхаванне грамадзянска-патрыятычных, маральных якасцей асобы асабліва актуальна ў падлеткавым узросце. Юнацтва характарызуецца інтэнсіўным фарміраваннем светапогляду, развіццём маральнай пазіцыі. Этап адкрытых праяў светапогляду і маралі займае ўзроставы перыяд ад 12 да 16 гадоў, гэта значыць характарызуецца высокай сензітыўнасцю да прыняцця нацыянальнай ідэі, развіцця нацыянальнай самасвядомасці, грамадзянскай пазіцыі. Падлеткавы ўзрост – гэта спецыфічная стадыя развіцця каштоўнасных арыентацый, у структуры якіх маральныя павінны стаць вызначальнымі пры фарміраванні жыццяздольнасці асобы, якая валодае дастатковымі ўнутранымі рэсурсамі для паспяховага ўзаемадзеяння ў соцыуме.

Праблема патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення з’яўляецца адной з цэнтральных, да яе вырашэння звярталіся і звяртаюцца ў сваіх працах як класікі педагагічнай думкі (В. А. Сухамлінскі, А. С. Макаранка, К.Д. Ушынскі), так і сучасныя даследчыкі. Па-ранейшаму актуальнымі задачамі застаюцца пошук дзейсных механізмаў і сродкаў патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі, распрацоўка педагагічных умоў маральна-патрыятычнага станаўлення асобы.

У педагагічнай літаратуры патрыятычнае выхаванне разумеецца як спецыяльна арганізаваны, мэтанакіраваны і кіраваны працэс развіцця патрыятычных пачуццяў, фарміравання патрыятычнай свядомасці і паводзін дзяцей і вучнёўскай моладзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Згодна з Канцэпцыяй выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь (Мінск, 2000) найбольш актуальнымі напрамкамі патрыятычнага выхавання з'яўляюцца:

– грамадзянска-патрыятычны – уяўляе сабой прывіццё павагі да Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, паглыбленне ведаў сутнасці і зместу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

– культурна-патрыятычны – яго аснову складае культурна-гістарычны кампанент (культурныя традыцыі, нацыянальны каларыт);

– спартыўна-патрыятычы – яго асноўны кампанент – фізічны;

– героіка-патрыятычны – выхаванне любові да Радзімы і павагі да яе Узброеных сіл, абаронцаў айчыны на аснове гераічнага мінулага свайго народа;

– ваенна-патрыятычны – выхаванне любові да сваёй Радзімы і фарміраванне маральна-псіхалагічнай гатоўнасці да выканання канстытуцыйнага абавязку па абароне айчыны.

Шырокімі магчымасцямі для рэалізацыі названых напрамкаў выхаваўчай работы з падрастаючым пакаленнем валодаюць музеі як навукова-даследчыя і навукова-асветныя інстытуты, якія ажыццяўляюць захоўванне, вывучэнне і папулярызацыю помнікаў гісторыі і культуры роднага краю. Узаемадзеянне музея і сістэмы адукацыі набывае асаблівы сэнс у сучасных умовах: збядненне духоўных каштоўнасцей, зніжэнне этычнай матывацыі, распад сямейных традыцый, праблема памяці пакаленняў. Патрэбу, якая ўзнікае ў дадатковых крыніцах аднаўлення гармоніі са светам, можа ў значнай меры задаволіць менавіта музей – унікальная гістарычная, культурная, маральная, прыродная, мастацкая прастора, якая валодае велізарнымі кампенсатарнымі і адаптацыйнымі магчымасцямі [6].

Разглядаючы розныя сродкі патрыятычнага выхавання падлеткаў, прадстаўнікі навукова-педагагічнай грамадскасці прыходзяць да адзінадушнага меркавання пра тое, што гэты працэс павінен насіць дзейнасны характар, пры якім асоба дзіцяці займае актыўную пазіцыю суб'екта выхавання. На наш погляд, адным з дзейсных выхаваўчых сродкаў у музейнай прасторы можа выступіць сацыякультурная анімацыя, якая разумеецца ў шырокім сэнсе як самаарганізуючы грамадска-педагагічны рух, накіраваны на духоўнае аздараўленне грамадства, як інструмент рэгуляцыі сацыяльна-культурнага жыцця [5, с.113]. Сацыякультурная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

анімацыя характарызуецца відавой разнастайнасцю. З пункту гледжання змястоўнага крытэрыю прынята вылучаць анімацыю музычную, тэатральную, турысцкую, музейную і інш.

Музейная анімацыя – гэта дзейнасць па распрацоўцы і прадстаўленні спецыяльных праграм існавання наведвальніка музея ў музейнай экспазіцыі. Паняцце «анімацыя» ў перакладзе з італьянскай азначае «адушаўленне», «ажыўленне». Ажыўленне працэсу пазнання, які праходзіць у музейнай прасторы, надае яму актыўны характар, напаўняе высокім эмацыянальным зарадам [2]. Зыходзячы з гэтага, музейная анімацыя як сродак патрыятычнага выхавання падлеткаў грунтуецца на прынцыпе адзінства інфармацыйна-лагічнага і эмацыянальна-вобразнага ўздзеяння на свядомасць, пачуцці і паводзіны падлеткаў.

Музейная анімацыя ў залежнасці ад пастаўленых задач і спосабаў выкарыстання можа быць прадстаўлена як:

– прыём актывізацыі ўвагі наведвальнікаў падчас музейнай экскурсіі (напрыклад, у выглядзе персаніфікаванага вобраза экскурсавода, касцюміраванага абслугоўвання экскурсантаў);

– прыём «ажыўлення» музейнай экспазіцыі (наглядная дэманстрацыя функцый экспанатаў, прадастаўленне экскурсантам магчымасці «памацаць» аб’ект экспазіцыі, «папрацаваць» на ім, напрыклад, стрэліць з арбалета, размалоць зерне ў жорнах і інш.);

– дадатковая паслуга, якая стымулюе наведвальнасць музея (напрыклад, «Вяселле ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь»);

– кампанент комплекснай культурна-адпачынкавай праграмы на аснове ўзаемадзеяння музея з іншымі ўстановамі культуры ці дзеячамі мастацтваў (адкрыццё новай экспазіцыі, канцэрт майстроў мастацтваў, вечарына цікавых сустрэч з мастакамі, архітэктарамі, кампазітарамі і г.д.);

– цэласнае культурна-пазнавальнае тэатралізаванае дзеянне на аснове рэканструкцыі гістарычнай эпохі або падзеі.

Вырашаючы пытанні патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення, спецыялісты музейнай справы могуць выкарыстоўваць магчымасці анімацыі ва ўсёй разнастайнасці. Так, знаёмства з традыцыямі, звычаямі, укладам жыцця беларускага народа ў недзяржаўным музейным комплексе старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі» ў Пухавіцкім раёне Мінскай вобласці адбываецца праз адноўленае прадметна-прасторавае асяроддзе, праз прадастаўленне наведвальнікам магчымасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыняць удзел у стварэнні рамесных вырабаў. Акрамя таго, падлеткі маюць магчымасць у практычнай дзейнасці спазнаць асаблівасці беларускіх народных свят, абрадаў, прыняўшы ўдзел у фальклорна-этнаграфічных святах, правядзенне якіх стала ўжо традыцыйным і ў «Дудутках», і ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, а таксама ў іншых музеях краіны.

Асаблівую цікавасць у падлеткаў выклікаюць анімацыйныя праграмы на аснове гістарычных рэканструкцый, якія прыцягваюць увагу магчымасцю адчуць «дух эпохі», перажыць рамантыку прыгод і на гэтай аснове больш выразна зразумець тыя ці іншыя гістарычныя факты, падзеі, заканамернасці.

Гістарычная рэканструкцыя – гэта аднаўленне матэрыяльнай і духоўнай культуры былой гістарычнай эпохі на аснове дакладных (археалагічных, пісьмовых, выяўленчых) крыніц. Для вывучэння пытання, якое даследуецца, у гістарычнай рэканструкцыі ўжываюць ролевую гульню і навуковы эксперымент [4].

Вялікай папулярнасцю для рэканструкцый карыстаюцца ў цяперашні час эпоха Сярэднявечча, падзеі Першай і Другой сусветных войнаў.

Мэта рэканструкцый – стварэнне масавых тэатралізаваных прадстаўленняў, адлюстраванне карцін гістарычнага мінулага народа (бітваў, турніраў, парадаў і інш.). Месцам іх правядзення становяцца, як правіла, гістарычна сапраўдныя ландшафты – замкавыя, палацава-паркавыя комплексы, палі бітваў, гістарычныя кварталы гарадоў і г.д.

Для стварэння гістарычных рэканструкцый музеі ўзаемадзейнічаюць з ваенна-гістарычнымі клубамі, якія займаюцца даследаваннем звычаяў і нораваў пэўнай эпохі, узнаўленнем па старых тэхналогіях прадметаў побыту, адзення, зброі.

Гістарычныя рэканструкцыі ствараюць умовы для задавальнення пазнавальных патрэб, развіцця творчых здольнасцей падлеткаў, стымулююць цікавасць да гісторыі роднага краю, культуры свайго народа.

Варта заўважыць, што музейная анімацыя выкарыстоўвае арсенал метадаў і сродкаў, распрацаваных у музейнай педагогіцы, сярод якіх вядучае месца займаюць наступныя метады актывізацыі наведвальнікаў у музеі:

1) метад арганізацыі дыялагічных зносін;
2) гульнявы метад;
3) метад тэатралізацыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4) метад арганізацыі творчага спаборніцтва наведвальнікаў [3].

Сукупнасць дадзеных метадаў рэалізуецца ў форме квэстаў (гульняў-падарожжаў па музейных экспазіцыях), тэатралізаваных прадстаўленняў, фальклорных праграм, віктарын, конкурсаў знаўцаў і інш. Шырокае распаўсюджанне атрымала комплексная форма музейнай анімацыі – акцыя «Ноч музеяў», якая стварае перадумовы для актыўнага ўключэння падлеткаў у гісторыка-культурны кантэкст з мэтай далучэння да багатай спадчыны свайго народа, яго спазнавання і маральнага асэнсавання.

У цяперашні час музеямі краіны назапашаны багаты вопыт работы з падрастаючым пакаленнем з выкарыстаннем інтэрактыўных метадаў музейнай анімацыі. Так, у 2010 г., адзначаным як год 65-годдзя вялікай Перамогі, усе дзяржаўныя музеі краіны падрыхтавалі ўрачыстыя мерапрыемствы да гэтай даты. Брэсцкі абласны краязнаўчы музей разам з ваенна-патрыятычнымі клубамі правёў акцыю «Вясна Перамогі адна на ўсіх», Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава арганізаваў абласны конкурс навучэнцаў «Нам гэты мір завешчана зберагчы». У Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.П. Масленікава праведзены пленэр па жывапісе «Вобразы Радзімы ў выяўленчым мастацтве». Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» падрыхтаваў шэраг выставак з уласных фондаў: «Мір вачамі дзяцей. Мая любімая Брэсцкая крэпасць», «Лёс чалавека» – да 110-годдзя маёра П.М. Гаўрылава, аднаго з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці, «Заходні фарпост Айчыны», «Мундзір Айчыны» [1].

Разам з тым, як справядліва адзначае Я.А. Кісялёў, выкарыстанне новых інтэрактыўных формаў узаемадзеяння з наведвальнікам не ўкладваецца ў ранейшыя формы, якія традыцыйна адносяцца да сферы музейнай педагогікі. Узнікае неабходнасць у стварэнні матэрыяльных умоў для анімацыйнай дзейнасці, перш за ўсё – змяненне ўнутрымузейнай прасторы як рэкрэацыйнай зоны. Гэтыя тэндэнцыі ўлічваліся пры распрацоўцы новага будынка Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе плануецца арганізацыя інтэрактыўных экспазіцый з выкарыстаннем самых новых музейных тэхналогій. Застаючыся, як і ранней, цэнтрам навуковага дакументавання і навукова-даследчай дзейнасці, музей стане новым сацыякультурным ландшафтам краіны, які дазволіць наведвальнікам перанесціся ў ваенную эпоху, адчуць увесь трагізм і высокі гераізм таго часу, што, несумненна,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

створыць умовы для фарміравання і развіцця патрыятычных пачуццяў і грамадзянскай свядомасці падрастаючага пакалення.

Такім чынам, зварот да сродкаў музейнай анімацыі забяспечвае адлюстраванне ў музейным зборы гістарычных фактаў, падзей, працэсаў не толькі з дапамогай музейных прадметаў, але і праз уключэнне наведвальнікаў у гульнявую сітуацыю, праз выкарыстанне мастацкай вобразнасці ў розных формах культурна-выхаваўчай работы. Усё гэта стварае ўмовы для мэтанакіраванага ўздзеяння на свядомасць і пачуцці падлеткаў у працэсе патрыятычнага выхавання.


1. *Беларуская* культура сёння : гадавы агляд, 2010 / І.В. Анціпенка [і інш.] ; пад агул. рэд. Т.І. Стружэцкага; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т культуры Беларусі. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2011. – 144 с.

2. *Киселев, Е.А.* Подготовка специалистов туристского вуза к разработке музейных анимационных программ : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.08 / Е.А. Киселев; Рос. междунар. академия туризма. – М., 2009. – 27 с.

3. *Полищук, И.В.* Взаимодействие школы и музея в нравственно-эстетическом воспитании учащихся / И.В. Полищук, А.А. Фоменко // Воспитание в современных условиях : сб. науч. ст. – Минск : НИО, 1999. – 198 с. – С. 153–164.

4. *Пядушкина, И.И.* Анимация в социально-культурном сервисе и туризме : учеб.пособие / И. И. Пядушкина. – Иркутск : Изд-во Иркут. гос.ун-та, 2011. – 192 с.

5. *Тарасов, Л.В.* Социокультурная анимация: истоки, традиции, современность / Л. В. Тарасов. – М. : ЧСА «Одухотворение», 2008. – 132 с.

6. *Шевелилова, Н.* Занимательная педагогика / Н. Шевелилова // Мир музея. – 2013. – № 2. – С. 14–18.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ